# СА СВЯТАМ, ДАРАГІЯ ЖАНЧЫНЫ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1 мая 1935 г.

1980 г.
6
САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 8 (1272)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## НАВІНЫ БДУ

### УСЕСАЮЗНЫ СЕМІНАР

камісараў рэспубліканскіх, краявых, абласных студэнцкіх будаўнічых атрадаў прайшоў у Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна.

З уступным словам «Аб перспектывах развіцця універсітэта» перад прысутнымі выступіў рэктар універсітэта акадэмік АН БССР У. А. Белы.

Удзельнікі семінара пазнаёміліся з сістэмай падрыхтоўкі студэнцкіх будаўнічых атрадаў у камсамольскай арганізацыі універсітэта, з работай парткома і камітэта камсамола па ўдасканаленню дзейнасці СБА і падрыхтоўкі актыву будатрадаў да вядзення агітацыйна-прапагандысцкай работы.

### ЛІТАРАТУРНЫ ВЕЧАР,

прысвечаны 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, адбыўся нядаўна ў інтэрнаце № 4 на Паркавай магістралі. Арганізаваны ён быў філалагічным факультэтам разам з аддзелам рэдкіх кніг бібліятэкі Белдзяржуніверсітэта.

У час вечара працавала выстаўка «Рэдкія выданні ў фондзе бібліятэкі БДУ». Быў зроблены агляд літаратуры. Потым перад прысутнымі выступіў дацэнт П. І. Ткачоў, загадчык кафедры рускай савецкай літаратуры. Ён расказаў аб тым, як падарожнічаў па ленінскіх мясцінах, што цікавага бачыў у Шушанскім. Пазнаёміў студэнтаў са сваімі творамі, прысвечанымі У. І. Леніну, паведаміў аб гісторыі іх напісання.

### ЗАКОНЧЫЎ РАБОТУ

Рэспубліканскі навукова-практычны семінар дырэктараў, загадчыкаў аддзелаў і метадыстаў бібліятэк ВНУ, які быў арганізаваны Мінвузам БССР і фундаментальнай бібліятэкай БДУ імя У. І. Леніна.

Перад прысутнымі выступілі І. У. Арэхоўская, дырэктар бібліятэкі БДУ, І. С. Ротар, дырэктар бібліятэкі Кішынёўскага політэхнічнага інстытута, Л. С. Часнакова, прадстаўніца Тартускага універсітэта, Г. І. Раманавене, дырэктар бібліятэкі Каўнаскага політэхнічнага інстытута, А. А. Сінкевіч, загадчык аддзела рэдкай кнігі БДУ і іншыя.

Яны расказалі аб арганізацыі бібліятэчных фондаў ВНУ на сучасным этапе, аб структуры фондаў, іх расстаноўцы, аналізе кнігазабяспечанасці і выкарыстання падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

---

ВИКТОР ГИН

ДАРИТЕ ЖЕНЩИНАМ
ЦВЕТЫ,
КАК СИМВОЛ
ПОКЛОНЕНЬЯ,
ОХВАТИТ ПЛАМЯ
КРАСОТЫ
ИХ ЛИЦА НА
МГНОВЕНЬЕ.
НО НЕ ПОГАСНЕТ
ЭТОТ СВЕТ
СКВОЗЬ ГОДЫ
И НЕНАСТЬЯ:
КТО БЫЛ ОДНАЖДЫ
ИМ СОГРЕТ,
ТОТ ЗНАЕТ ЦЕНУ
СЧАСТЬЯ.
ДАРИТЕ ЖЕНЩИНАМ
ЦВЕТЫ,
И МОЛОДЫМ И СТАРЫМ,
ЗА ТО, ЧТО ЗЕРНА
ДОБРОТЫ
ДАРИТЬ НАМ
НЕ УСТАЛИ,
ЗА ТО, ЧТО МНОГО ЛЕТ
ПОДРЯД
МЫ В ИХ НЕЗРИМОЙ
ВЛАСТИ.
КТО ДРУЖБОЙ
ЖЕНЩИНЫ БОГАТ,
ТОТ ЗНАЕТ ЦЕНУ
СЧАСТЬЯ.
ДАРИТЕ ЖЕНЩИНАМ
ЦВЕТЫ,
ОТ ВСЕЙ ДУШИ
ДАРИТЕ!
ДОВЕРЬТЕ СВЕТЛЫЕ
МЕЧТЫ,
ТРЕВОГИ НЕ ТАИТЕ.
ПУСТЬ БУДЕТ С НАМИ
НАВСЕГДА
ИХ НЕЖНОЕ УЧАСТЬЕ;
КТО СЕРДЦЕ ЖЕНЩИНЕ
ОТДАЛ,
ТОТ ЗНАЕТ ЦЕНУ
СЧАСТЬЯ.



---

ПРЭМ'ЕРА АЎКЦЫЁНА

## ВАША СЛОВА, ЭРУДЫТЫ!

НА МЕХМАЦЕ прайшоў кніжны аўкцыён—першае такое мерапрыемства ў рэспубліцы. Аб гэтым паведаміла прысутным член журы Л. К. Зізіка — метадыст Мінскага гарадскога таварыства аматараў кнігі. Удзельнікі аўкцыёна, сярод якіх былі студэнты з мехмата, гістфака, ФПМ, а таксама з МРТІ і БПІ, павінны былі адказаць на шэраг пытанняў па рускай, беларускай і замежнай літаратурах. Юнакі і дзяўчаты, большасць з якіх з'яўляюцца членамі Усесаюзнага таварыства аматараў кнігі, даказалі, што членскія білеты таварыства яны маюць не выпадкова. На ўсе пытанні даваліся дакладныя і поўныя адказы. Іншыя пытанні вядучы нават не паспяваў дачытаць да канца—у розных кутках аўдыторыі маланкава ўзляталі ўгару рукі. «Назавіце сучасных беларускіх паэтэс», «Як сапраўднае імя О'Генры?», «Чым падабаюцца вам героі твораў У. Караткевіча?» —памочнікі журы не паспявалі раздаваць заліковыя карткі са штампам таварыства. За правільны і поўны адказ прысуджалася 5 картак, за дапаўненне — 3. Найбольш эрудзіраваныя знаўцы літаратуры набралі за час віктарыны больш чым па 40 картак.

— А казалі, што фізікі і матэматыкі літаратурай не цікавяцца,— усміхаўся старшыня журы, член Саюза пісьменнікаў БССР, кандыдат філалагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры АН БССР А. І. Мальдзіс.

А пасля віктарыны пачаўся аўкцыён. «Расплачвацца» за кнігі шырокага попыту, якія разыгрываліся, трэба было не грашыма, а толькі што «заробленымі» карткамі. І тыя са студэнтаў, хто прадэманстраваў найбольш грунтоўныя веды і атрымаў вялікую колькасць картак, панеслі дадому «Отверженных» В. Гюго, зборнікі твораў Шукшына, вершы рускіх паэтаў і інш.

В. ЕФІМЕНКА.

---

## ГРУНТОЎНАЯ РАЗМОВА

АДБЫЛОСЯ сумеснае пасяджэнне старшынь штабаў «Камсамольскага пражэктара» факультэтаў і членаў штаба «КП» універсітэта, на якім вялася грунтоўная размова аб рабоце «пражэктарыстаў» у мінулым месяцы.

Цікавымі думкамі падзяліліся старшыні штабаў С. Броўка (юрфак), Ул. Яроменка (гістфак), дзе справы камсамольскіх кантралёраў знаходзяцца на належным узроўні.

Намеснік старшыні штаба «КП» БДУ А. Аладзін падвёў вынікі работы факультэцкіх штабаў, адзначыў слабыя месцы ў рабоце. На пасяджэнні распрацаваны план мерапрыемстваў «Камсамольскага пражэктара» на наступны месяц.

В. ЧАРНУШЭНКА.



# НАША СВЕТА

У ІНТЭРНАЦЕ № 4 Святлану Чабуранаву я не застала. Там былі толькі яе сяброўкі. «Напэўна ў прафкоме затрымалася, — паведаміла Валя Маташук. — Там у яе заўсёды справа ёсць: прафсаюзную дакументацыю трэба праверыць, наяўнасць членскіх узносаў, прафсаюзных картак. Наша Света — член арганізацыйна-масавай камісіі». Наша Света... Калі пачалі так называць яе? Можа, на «першай бульбе»... Ці ў студэнцкай аўдыторыі за кнігай, калі неабходна была Свеціна дапамога... А можа, у будаўнічым атрадзе імя Восіпавай. Памятаеце, як наша Света танцавала жартоўную кадрылю?.. Яна, здаецца, укладвала ў танец усю сябе. Свой запал, жыццярадаснасць, абаяльнасць, добры настрой перадавала іншым.

— Рабіць добрае для іншых у Светы стала жыццёвым правілам, — расказвае Люда Брагінец. — Нярэдка здзіўляешся, як у яе хапае цярплівасці, вытрымкі, калі мне, напрыклад, трэба дапамагчы па нямецкай мове, а іншаму — проста парадай, цёплым словам.

Не, яна не любіць, калі яе хваляць, ніколі не падкрэслівае сваёй перавагі над іншымі (Света вельмі начытаная, разумная). Наадварот, колькі разоў уключалася яна ў гарачыя студэнцкія размовы або спрэчкі, але неяк непрыкметна, зводдаль. І ніхто не заўважаў адразу, што спрэчку вырашала слова Светы — спакойнае, удумлівае.

Можа, такія чалавечыя яе якасці, як бескарыслівасць, пачуццё павагі да іншых і гумар дапамагаюць Святлане ў вучобе і грамадскай рабоце. Бо гэтыя якасці вельмі патрэбны ў адносінах паміж людзьмі. А ёй як члену арганізацыйна-масавай камісіі прафбюро юрыдычнага факультэта неабходна ўвесь час сутыкацца з такімі рознымі і складанымі студэнцкімі характарамі.

...У прафбюро яна толькі год. Але, згадзіцеся, дабіцца своечасовай здачы прафсаюзных членскіх узносаў усяго факультэта, сачыць за наяўнасцю і афармленнем прафсаюзных білетаў, весьці вучобу прафоргаў — справа не з лёгкіх і не кожнаму пад сілу. Асабліва шмат трэба «паваждацца» з першакурснікамі. І тут проста неабходны добразычлівае слова, парада.

Студэнт, які выконвае тыя ці іншыя абавязкі ў грамадскай рабоце, павінен быць сам зацікаўлены ў іх. А як зацікавіць? У групе (а тут Света—намеснік камсорга па ідэалагічнай рабоце) было прасцей заахвоціць людзей, усё ж такі ўсе знаёмыя. Праводзілі раз у нядзелю палітінфармацыі. Бачыць Света—нецікава групе. І прапанавала рыхтаваць тэматычныя. І справа, як кажуць, «завярцелася». А палітінфармацыі некаторых, як, напрыклад, Людмілы Пальчэк «Аб узаемаадносінах СССР і ЗША», перараслі ў цікавыя лекцыі — так узнікла лектарская група, якая пачала выступаць на прадпрыемствах горада і раёна. І ўжо не было фармальных «галачак», якія паведамлялі аб тым, што сёння, напрыклад, правялі палітінфармацыю...

— Камсамольская работа ў групе дапамагае мне і ў прафсаюзнай, — гаворыць Света.— Вось толькі як заахвоціць больш людзей да прафсаюзных спраў? Напэўна, гэта магчыма толькі на аснове спалучэння прафсаюзнай работы з камсамольскай. У нашай групе і многіх іншых такая практыка апраўдала сябе, але яна далей сумесных сходаў (і то агульных, як, напрыклад, аб падвядзенні вынікаў сесіі) не ідзе. А чаму б не практыкаваць гэта ў маштабах факультэта, калі тут яшчэ больш магчымасцей для праяўлення агульных інтарэсаў, як прафсаюзных, так і камсамольскіх...

У гэтых развагах, меркаваннях — уся Света: сціплая, спакойная, упэўненая.

Здаецца, як ужыліся ў яе душы дабрата і мяккасць з прынцыповасцю і патрабавальнасцю да сябе і іншых. «Ні аднаго сходу не абышлося без Светы», — заўважае Міша Клопаў, старшыня прафсаюзнага бюро.

Так, ёй заўсёды ёсць справа да таго, ці правільна размеркавалі пуцёўкі ў прафілакторый, хто жыве ў інтэрнаце, ці ўсё ўлічылі пры назначэнні стыпендыі....

Звычайныя прафсаюзныя справы. Колькі іх!

...У той вечар з прафкома яна вярнулася позна. Крыху змораны, але вясёлы твар з выразнымі шэрымі вачыма. А ў руках — кіпа свежых газет.

— Сёння ў «Знаменцы» вельмі цікавы матэрыял аб музыцы. Пачытайце...

І вось ужо газета «пераходзіць» з рук у рукі, а Света, узбуджаная, расчырванелая, дзеліцца са сваімі сяброўкамі ўражаннямі дня, не дарэмна пражытым.

**А. ФІЛІМАНЮК.**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**

# НА МОВЕ ДРУЖБЫ

**ПЕРШЫНГ САЙД ПРЫЕХАЛА Ў НАШУ КРАІНУ З ІРАКА. ЯНА СТУДЭНТКА II КУРСА ФАКУЛЬТЭТА ЖУРНАЛІСТЫКІ, ЧЛЕН САВЕТА ДРУЖБЫ УНІВЕРСІТЭТА, А З НЯДАЎНЯГА ЧАСУ — ЯГО ПРЭЗІДЭНТ.**

**— Першынг, раскажы, калі ласка, што ўяўляе сабой арганізацыя, якую ты ўзначаліла. Якім мэтам служыць савет дружбы!**

— Савет дружбы — добраахвотнае аб'яднанне замежных і савецкіх студэнтаў, аспірантаў і стажораў, якія займаюцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна. У яго састаў уваходзяць прадстаўнікі многіх краін Еўропы, Блізкага Усходу, Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі.

У статуце савета запісана, што гэта арганізацыя «створана з мэтай умацавання дружбы і ўзаемаразумення паміж студэнтамі розных краін, азнаямлення замежнай моладзі з савецкай рэчаіснасцю». Удзел у рабоце савета дружбы прыносіць нам вялікую карысць.

**— У якіх канкрэтна формах праяўляецца ваша работа!**

— Мы імкнёмся рабіць усё магчымае, каб нашы задумы і планы не заставаліся толькі на паперы. Сумесна вучымся, працуем і адпачываем. Гэта стала традыцыяй. У мінулым семестры правялі два суботнікі. Заробленыя грошы пералічылі ў фонд зямляцтваў. А як цікава і разнастайна праходзяць у нас вечары адпачынку, віктарыны, дыскатэкі ў інтэрнатах. Здаецца, усе размаўляюць на адной мове — мове дружбы.

Але, бадай, самую вялікую ўвагу савет удзяляе вучобе. Для гэтага створаны вучэбны сектар, які ўзначаліла студэнтка механіка-матэматычнага факультэта Ірына Тарноўская.

**— Першынг, напэўна, у вас склаўся дружны калектыў!**

— Керсцік Ласке, Данута Грабоўска, Ала Шамянкова, Ігар Велічанскі... Без іх нельга ўявіць сабе работу савета дружбы. Такі прыклад. Студэнт гістарычнага факультэта Ігар Велічанскі з'яўляецца старшынёй дыскусійнага клуба «Палітыкус». Кожнае пасяджэнне клуба — сапраўднае свята. Студэнты не толькі знаёмяцца з міжнародным становішчам, разглядаюць тыя ці іншыя праблемы, але выказваюць уласныя думкі, расказваюць пра жыццё ў розных краінах свету.

Мне асабліва хочацца адзначыць студэнтку трэцяга курса гістарычнага факультэта Люду Лінік. Люда — член камітэта камсамола універсітэта, адказная за інтэрнацыянальную работу, наш дарадчык і добры таварыш. Менавіта такія студэнты з'яўляюцца ядром савета дружбы.

**— Ці не перашкаджае вучобе работа ў савеце дружбы!**

— Сумяшчаць вучобу з грамадскай работай — справа складаная. Тым больш для замежнай студэнткі. Даводзіцца шмат працаваць над падручнікамі, а іншы раз, як кажуць, браць навуку «штурмам». Калі асабліва цяжка — на дапамогу прыходзяць савецкія сябры. Я ў гэтым упэўнілася.

**— А зараз, Першынг, твой ідэал у жыцці!**

— Анжэла Дэвіс, Валянціна Нікалаева-Церашкова, Суад Хайры. Апошняя — член ЦК камуністычнай партыі Ірака, мужная жанчына-патрыёт, якая доўгія гады знаходзілася за турэмнымі кратамі. Зараз Суад Хайры на свабодзе і зноў змагаецца за шчасце свайго народа.

8 Сакавіка — Міжнародны жаночы дзень. Карыстаючыся выпадкам, хачу павіншаваць маіх сяброўак і наогул усіх жанчын свету з гэтым цудоўным святам. Шчасця! Радасці! Усмешак!

**Інтэрв'ю ўзяў А. ЛАЗОЎСКІ,**
**студэнт II курса журфака.**



# НЯСТОМНАСЦЬ

Соловьи, соловьи,
не тревожьте солдат...

ГУЧЫЦЬ песня... З тых, пра якія гавораць: «за сэрца бярэ», з тых, што не сціраюцца ў памяці ні поступам гадоў, ні мітуснёю будняў. Марыя Парфір'еўна сядзела б вось так у задуменні і слухала яе бясконца. Ціха. Хіба толькі з-за акна даносіцца гул тралейбусаў, гоман людской плыні...

Соловьи, соловьи,
не тревожьте солдат...

І адышлі ў небыццё турботы. Засталася толькі песня... Унук раптам са здзіўленнем заўважае, што ў вачах бабулі заблішчалі слёзы. Нялёгка, калі вайна прайшла праз сэрца. У такія хвіліны Марыя Парфір'еўна ўспамінае тых, хто болей ніколі не ўсміхнецца ёй, не падымецца разам па універсітэцкіх прыступках. Успамінае Лёню Сокала — жартаўніка і весяльчака. Песні вельмі любіў. І сам хораша спяваў. Колю Бабчынскага, Афанасія Налівайку... Усіх сваіх аднакурснікаў, якія не вярнуліся з фронту. Дні бягуць за днямі, гады ідуць за гадамі, але памяць захоўвае іх твары, іх імёны. Гэта не забываецца.

Кожны новы дзень М. П. Баранавай, выкладчыцы гістарычнага факультэта універсітэта, — гэта новыя клопаты і радасці, хваляванні і сустрэчы. Для яе ён пачынаецца вельмі рана, з узыходам сонца. У народзе гавораць, што «хто рана ўстае, таму бог дае». Верыць ці не верыць Марыя Парфір'еўна ў гэтую прымаўку, але вось ужо шмат гадоў сустракае яна першыя сонечныя промні світанку за пісьмовым сталом. Раніцай працуецца больш плённа. Можа таму любіць чытаць свае лекцыі першымі. Вядзе яна курс лекцый дакастрычніцкага перыяду гісторыі СССР, спецкурсы «Гісторыя рускай культуры», «Маркс і Энгельс аб Расіі» і іншыя. Асабліва любіць чытаць для першакурснікаў. Іх непасрэднасць, даверлівасць, іх цікаўнасць не можа не закрануць яе душу як педагога, як чалавека. Часам, бывае, Марыя Парфір'еўна непрыкметна адступае ад тэмы лекцыі, пачынае расказваць аб родным універсітэце, сваім даваенным студэнцкім жыцці. Дзеліцца думкамі аб сённяшняй моладзі, студэнтах.

Шмат увагі аддае навуковай рабоце. Гурток, якім кіруе М. П. Баранава, падрыхтаваў у гэтым годзе 37 дакладаў. Ёсць чым пахваліцца. У 1978 годзе даклад яе студэнткі Р. Аблавай «Уклад дзекабрыстаў у развіццё гуманітарных навук» атрымаў на Усесаюзным конкурсе навуковых работ дыплом Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК ВЛКСМ.

Кожны з нас у школе «прайшоў» па старонках падручніка «Гісторыя БССР». М. П. Баранава — адзін з яго аўтараў. З гонарам расказвае яна аб гісторыі роднай Беларусі. Гэта і вызначыла тэму яе даклада «Здзяйсненне ленінскай нацыянальнай палітыкі ў дзяржаўным будаўніцтве БССР» на сімпозіуме, прысвечаным гісторыі Беларусі. Сімпозіум, арганізаваны Іенскім універсітэтам, праходзіў у кастрычніку 1979 года ў Берліне.

Чалавек незвычайнай чуласці і дабраты. Так гавораць пра яе калегі па рабоце, студэнты. Марыя Парфір'еўна шчодра дзеліцца сваёй дабратой з людзьмі, чужыя беды і горыч успрымае як сваё, асабістае.

...Даўно было гэта. Сёння ўспамінаецца з нейкай шчымлівай радасцю... Прачытала яна аб дзецях героя Брэсцкай крэпасці Шаблоўскага. Да глыбіні душы ўскалыхнула жанчыну публікацыя. Ёй захацелася, каб дзеці адчулі мацярынскі клопат, любоў. Так паляцела ў Брэст шчырае, усхваляванае пісьмо. З нецярпеннем і незразумелай трывогай чакала адказу. І ён прыйшоў! Ад радасці слёзы выступілі на вачах. Таня Шаблоўская часта прыязджала да Марыі Парфір'еўны. Часам і ўсё лета праводзіла тут. Была і яна ў Брэсце. Да сённяшняга дня пішуць, сустракаюцца...

У кожнага з нас ёсць свой ідэал, да якога імкнешся. У сваім камсамольскім білеце Марыя насіла маленькі здымачак чалавека, стаўшага для яе прыкладам мужнасці і высакароднасці. Гэта чалавек гераічнага лёсу, змагар за вызваленне Заходняй Беларусі—С. В. Прытыцкі. Потым былі асабістыя сустрэчы з Сяргеем Восіпавічам. Юначае захапленне перарасло ў трывалае сяброўства з сям'ёй Прытыцкіх.

Ганарыцца Марыя Парфір'еўна знаёмствам з вядомым беларускім пісьменнікам М. Ц. Лынькоўым. Сярод тых, хто прыйшоў падтрымаць яе ў горы, калі муж памёр ад ваенных ран, быў і ён. Клапаціўся, дапамагаў чым мог ім з дачкою. У дачкі ўжо двое сыноў растуць. Сама Алена пайшла па сцежцы маці. Працуе на кафедры новай і навейшай гісторыі гістфака. І хто ведае, можа і ўнукі пойдуць тым жа

# ЗАСЛУЖЫЦЬ ПАВАГУ



ВОСЬ ужо 12 гадоў інтэрнат № 1 займае першае месца ў сацспаборніцтве за культурны быт сярод інтэрнатаў універсітэта. Гэта выклікае цікавасць да асаблівасцей арганізацыі быту ў самым старым інтэрнаце БДУ, дзе жывуць студэнты гістарычнага факультэта.

Рэгулярнае падвядзенне вынікаў сацспаборніцтва ў інтэрнаце на лепшы пакой і лепшы паверх здзяйсняе тут студсавет. Гэта забяспечвае зацікаўленасць кожнага студэнта падтрымліваць парадак у пакоях і на паверхах.

Паспяхова працуе савет ленінскага пакоя, які на міжвузаўскім конкурсе заняў адно з першых месц. Тут праходзяць прагляды тэлеперадач, урачыстыя сходы, чытаюцца лекцыі на тэмы маралі, аб сучасных міжнародных адносінах, а зусім нядаўна тут праходзіла сустрэча з артыстамі Белдзяржфілармоніі.

У інтэрнаце дзве чытальныя залы і бібліятэка. Тут ёсць усе неабходныя ўмовы не толькі для падрыхтоўкі да заняткаў, але і для адпачынку, за арганізацыю якога таксама адказваюць самі студэнты.

Культмасавы сектар рэгулярна праводзіць святочныя вечары адпачынку, вечары ў гонар імяніннікаў. У гэтыя дні працуе студэнцкі радыёвузел. Па заяўках студэнтаў выконваюцца іх любімыя песні, гучаць віншаванні, пажаданні.

Але зладжанае жыццё інтэрната залежыць не толькі ад добрай работы студсавета. Будні студэнцкія нельга сабе ўявіць без прыветлівай цёплай усмешкі, добрага слова жанчыны, на плячах якой ляжаць усе клопаты і турботы аб утульнасці і добраўпарадкаванасці студэнцкага жыцця, аб тым, каб, вярнуўшыся з заняткаў або проста з прагулкі, рабяты і дзяўчаты адчувалі сябе зусім як дома. Гэта жанчына — камендант інтэрната № 1 Надзея Сяргееўна Галіна. Ад яе залежыць своечасовае рашэнне ўсіх жыллёва-бытавых пытанняў — абмен пасцельнай бялізны, дробны рамонт у жылых пакоях, дзяжурства на вахце і г. д.

У гэтых пытаннях у Надзеі Сяргееўны ніколі не ўзнікае цяжкасцей, таму што побач з ёю знаходзіцца студэнцкі актыў, які ёй заўсёды прыходзіць на дапамогу.

Як вопытны педагог яна заўсёды можа знайсці падыход да кожнага студэнта і прымушае яго паверыць у тое, што ён сам і ёсць гаспадар свайго інтэрната. У кожным з іх камендант бачыць толькі самае добрае — нястомнага памочніка, надзейнага сябра, з якім лёгка і проста знайсці выхад з любой сітуацыі, ліквідаваць самыя неспадзяваныя непаладкі.

Надзея Сяргееўна імкнецца выхаваць у юнакоў і дзяўчат пачуццё беражлівасці да свайго жылля. Да рашэння гэтай задачы яна падыходзіць не як адміністратар, а як старэйшы сябар, маці. Такія прынцыпы ў рабоце Надзеі Сяргееўны дапамагаюць ёй дабівацца адсутнасці канфліктаў і поўнага ўзаемаразумення з абслугоўваючым персаналам інтэрната і студэнтамі. У адказ на гэта яны імкнуцца апраўдаць давер да іх старэйшага таварыша, плацяць ёй бязмежнай любоўю і павагай.

**Н. ЛАПЕТА,**
**студэнтка III курса журфака.**

---

шляхам. Мабыць невыпадкова нядаўна на ранішніку ў дзіцячым садзе шасцігадовы Вася назваў без запінкі ўсе 15 саюзных рэспублік. Без уплыву бабулі тут не абышлося. Расце дынастыя гісторыкаў...

Гэта жачына здолела пранесці праз жыццёвыя выпрабаванні сваю невычэрпную энергію, сваю бязмежную аддансць справе, грамадскай рабоце. М. П. Баранава—старэйшы прафсаюзны актывіст універсітэта. Адзінаццаты год з'яўляецца членам прэзідыума Рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў вышэйшай школы. Многае дала работа ў ЦК ВЦСПС, у састаў якога Марыя Парфір'еўна ўваходзіла 7 гадоў. Але самым яркім успамінам прафсаюзнай дзейнасці з'яўляецца XIV з'езд прафсаюзаў краіны, дэлегатам якога яна была. Як зараз, бачыць Крамлёўскі Палац з'ездаў, адчувае радаснае хваляванне...

Намеснік старшыні навукова-метадычнай камісіі гістарычнага факультэта, член рэдкалегіі выдавецтва «Народная асвета»... Гэты спіс можна працягваць далей. І усюды яна паспявае. Некалькі год запар узначальвае камісію Белсаўпрофа па рабоце з моладдзю. Справы сённяшняга маладога пакалення хвалююць яе так, як некалі — свайго. Сустрэчы з моладдзю, асабліва студэнцтвам, для яе заўсёды жаданыя. Гродна, Віцебск, Магілёў, Брэст... Тут яе ведаюць у многіх навучальных установах, з цеплынёй успамінаюць. А ў Гомельскім універсітэце была старшынёй прыёмнай экзаменацыйнай камісіі, кіравала дыпломнымі працамі студэнтаў. Увесь час Марыя Парфір'еўна імкнецца падтрымліваць сувязь са сваімі выпускнікамі. І не толькі апошніх год. Памятае і сустракаецца з першымі пасляваеннымі выпускнікамі. З 1945 года — ва універсітэцкіх сценах. Ганарыцца ёсць чым. Сярод яе дыпломнікаў — рэктар Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага А. Г. Караткевіч, заслужаны настаўнік рэспублікі Барыс Гордзін, рэктар Мінскага інстытута замежных моў Н. Г. Краснова, дэкан гістарычнага факультэта І. І. Царук. Такую своеасаблівую пераклічку можна працягваць доўга. Яе выпускнікі разляцеліся па ўсёй краіне, і ў кожнага ў сэрцы цёплыя ўспаміны аб гэтай нястомнай жанчыне.

У сямейным архіве М. П. Баранавай шматлікія Ганаровыя граматы, медалі, яна ўзнагароджана знакам «Выдатнік народнай асветы». Але ёсць адна бясконца дарагая рэліквія. Медаль «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне». Беручы яе ў рукі, Марыя Парфір'еўна паддаецца нахлынуўшым успамінам.

...Свярдлоўская вобласць. Сяло Гарна. Адзіная школа ў раёне. Тут настаўнічала ў час эвакуацыі яна, з чатырма курсамі універсітэта за плячыма. Не хапала паліва. Замярзалі чарніліцы. Халадзелі рукі і ногі. Разам з дзецьмі ішла яна ў тайгу нарыхтоўваць дровы. Здавалася, нельга ўсё гэта вынесці. Але выстаялі. Змораная, марозным вечарам ішла на мясцовы радыёвузел. Прыходзілася выступаць у даволі нязвыклай ролі. Ролі дыктара. Перадавала зводкі Саўінфармбюро. Ішла, перадавала, адганяючы стомленасць, холад, бо ведала, як чакаюць у таёжных пасёлках гэтых скупых радкоў. Не адпускалі яе ўральцы. Але вызваленыя родныя мясціны цягнулі да сябе. Разам з аднакурснікамі ўзнімалі Мінск з попелу і руін... І дзіўным было б пытанне: ці любіць яна гэты горад. Яго нельга не любіць, немагчыма не даражыць тым, чаму аддадзена амаль усё жыццё. Хаця і не часта здараецца, але любіць Марыя Парфір'еўна бесклапотна паблукаць па яго вуліцах і скверах, па мясцінах, асабліва дарагіх яе памяці.



...Сёння ноччу ішоў снег. А на календары ўжо вясна. І хутка зашапочуць ліпы на праспекце. За акном тралейбуса праплываюць знаёмыя будынкі, невядомыя людзі. Прыпынак. Вось і галоўны корпус універсітэта. Яе чакае работа...

**М. ЛАХВІЧ.**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**

---

**Напярэдадні 8 Сакавіка карэспандэнты газеты «Беларускі універсітэт» папрасілі студэнтаў адказаць на наступныя пытанні:**

**1. Ваш ідэал дзяўчыны; колькі шансаў сустрэць яе?**

**2. Як вы сябе адчуваеце, апынуўшыся адзін у жаночым асяроддзі?**



# БУДЗЬЦЕ ШЧАСЛІВЫМІ!

**3. З чым можна параўнаць дзяўчыну?**
**4. Якую ролю адыгрывае дзяўчына ў вашым жыцці?**
**5. Ваша думка аб ролі дзяўчыны ў БДУ?**
**6. Вашы пажаданні дзяўчатам да свята?**
**І вось што яны пачулі:**

**Уладзімір Муха, трэцякурснік геафака:**

1. Мой ідэал дзяўчыны? Гэта дзяўчына геафака. Прыходзьце, калі ласка, да нас у інтэрнат № 2 на пяты паверх. Сустрэнеце на кожным кроку.
2. У жаночым асяроддзі я адчуваю сябе ўпэўнена, знаходжу агульную тэму для размовы.
3. Нашых дзяўчат можна параўнаць з трапічным лесам, дзе на кожным квадратным кіламетры не сустрэнеш ніводнага аднолькавага дрэва.
4. Дзяўчына дапамагае ў жыцці. Яна робіць яго лепшым. Скажу больш, ператварае жыццё ў свята.
5. На маю думку, роля дзяўчыны ў нашым універсітэце... Яна ўносіць у агульны студэнцкі выгляд вядомую разнастайнасць.
6. Хацелася б пажадаць шмат. Але галоўнае: «Беражыце мужчын!».

**Андрэй Прэвеш, стажор кафедры арганічнай хіміі (Польшча):**

1. Перш за ўсё, дзяўчына павінна быць уважлівай да мужчын, разумнай. Яе прыгажосць — гэта сімвал кахання.
2. Калі я апынаюся ў жаночым асяроддзі, то не губляюся...
3. Маладую дзяўчыну можна параўнаць хіба толькі з вясною. Капрызнай, але цёплай і натхняючай.
4. Яна мая жонка, і гэтым, напэўна, усё сказана.
5. Што датычыцца навукі, то я лічу, што жанчына — рухавік прагрэсу.
6. Што пажадаць? Як пяецца ў адной вядомай польскай песні: «Будзьце да нас дабрэй і ўважлівей».

**Аляксандр Новікаў, трэцякурснік філфака:**

1. Прыгожая, але ў меру. Разумная, але не разумней мяне. Яна павінна мець разам са мной агульныя інтарэсы і густы, павінна любіць кнігу, эстрадную музыку, любіць дэтэктывы і навуковую фантастыку, любіць тэатр і кіно, шмат ведаць і ўмець у жыцці, быць добрай жонкай і прыемнай субяседніцай. Такую дзяўчыну знайсці ці сустрэць магчыма, але вельмі цяжка.
2. Як рыба ў вадзе сярод тых, каго я ўжо ведаю, і не ў сваёй талерцы, калі яшчэ ніхто не знаёмы.
3. Хочацца параўнаць дзяўчыну з цудоўнай казкай, пачатак якой ведаеш, а што будзе потым — невядома.
4. Верная сяброўка, памочнік ва ўсім. Нават проста цікавы чалавек, які заўсёды ўзнімае настрой. А гэта так важна ў жыцці.
5. «Без жанчын жыць на свеце нельга нам!» — спяваюць мужчыны ў адной папулярнай песні. Я, зразумела, далучаюся да гэтага выказвання. Тым больш, што наш факультэт, філалагічны, без іх наогул цяжка сябе ўявіць. Пры сучаснай фемінізацыі хлопцаў і эмансіпацыі дзяўчат трэба гаварыць не аб ролі дзяўчыны, а аб ролі нашага моцнага полу.
6. Ад усяго сэрца жадаю нашым прыгожым і мілым сяброўкам усяго самага-самага. Няхай будзе больш Таццян Ларыных і Наталляў Растовых, тургенеўскіх дзяўчат і дактароў Уласенкавых.

**Васіль Молчан, пяцікурснік мехмата:**

1. Дзяўчына павінна быць разумнай, прыгожай, павінна цябе разумець і весці сябе больш проста і звычайна. А самае галоўнае — быць шчырай у сваіх пачуццях. Сустрэць? Пяцьдзесят адзін шанс са ста.
2. Адчуваю сябе нармальна. Не чакаю ад жаночага акружэння нічога дрэннага.
3. Дзяўчыну нельга ні з чым параўнаць. Яна — індывідуальнасць.
4. Дзяўчаты ўзнімаюць настрой, дапамагаюць быць заўсёды спакойным і ўважлівым да іх.
5. Без дзяўчат на мехмаце не было б чаго рабіць і хлопцам, бо ўсё на свеце знаходзіцца ў непарыўнай і бясконцай сувязі.
6. Вясенняга настрою і здзяйснення ўсіх жаданняў у асабістым жыцці!

**Уладзімір Лісоўскі, трэцякурснік журфака:**

1. Аптымістычная, з гумарам і прыгожая. Думаю, што некалькі шансаў сустрэць яе ёсць.
2. Складанае пытанне. Тут многае залежыць ад таго, які настрой у дзяўчат. Ва ўсякім выпадку імкнуся не разгубіцца.
3. Мноства самых розных прыкладаў можна знайсці ў паэзіі, прозе, кіно, спектаклях, проста ў вуснай мове народа. Не хачу паўтарацца.
4. Паколькі жанаты — галоўную.
5. Вядома, што дзяўчат у БДУ больш, чым юнакоў. Таму іх роля тут, безумоўна, вельмі значная. Калі б не было дзяўчат, то, напэўна, і працэнт наведвання лекцый быў бы значна ніжэйшы. Зноў жа вельмі прыемна паказаць свае веды перад дзяўчатамі. Так што дзяўчына — гэта стымул. Вельмі моцны і станоўчы.
6. У гэтыя святочныя дні я жадаю ўсім дзяўчатам не сумаваць. Быць добрымі, вясёлымі і ў свята, і ў будні.

**Калі мы ўзялі гэтыя інтэрв'ю ў мужчынскай паловы нашага універсітэта, то прыйшлі да вываду, што нашы дзяўчаты, перш за ўсё, павінны заставацца дзяўчатамі. І таму ў дзень 8 Сакавіка мы жадаем усім вам, дарагія нашы прыгажуні, быць заўсёды мілымі, вясёлымі, па-жаночаму нелагічнымі, прыгожымі і, галоўнае, заставацца вечнай загадкай для мужчын. Будзьце шчаслівымі!!!**

**Інтэрв'ю ўзялі**
**А. КОЗЕЛ і**
**С. ЛЫСКАВЕЦ.**




**А. ЦВЯХ**

## УЧОРА

...Святлом таямнічым
мігцела імгла,
За вокнамі цёмнымі восень
Ад зайздрасці дзікай заснуць
не магла,
Вачэй тваіх зведаўшы просінь.

Гарачыя словы успеньвалі
кроў,—
Яны ж не былі нам патрэбны,
Бо шчырая еднасць не
прапнула слоў,
А толькі — блукання па небе.

І цікаў гадзіннік на сонным
стале,—
Адноснасці сведка суровы...
Пытанне навісла ў барвянай
імгле:
Заўтра — вяртанне ва ўчора?..

Учора — спакойны размераны
рытм,
Будзённасць і сытая змора...
...як цяжка чуць стрэлак
настойлівы спыт:
заўтра — вяртанне ва ўчора...
Плылі мы скрозь зорны абсяг
наяву,
І светла прыйшло разуменне,
Што толькі вось гэтым
імгненнем жыву,
Любоў — гэта выбух,
не тленне...

Дык дай жа, о, лёс мой, навек
мройны змрок!..
Няма для кахання больш гора,
Як зробім у заўтра
звычайны мы крок,
Але застанемся ва ўчора...





Кветкі любай...

Фотаэцюд **А. Стадуба.**

**В. СЕМЕНЧИК**

* * *

Уже протыкают небо
Дождя холодные спицы,
И листьев покров багровый
Пожаром горит на земле.
А я просыпаюсь утром,
И вижу чужие лица...
Мне кажется, что я прожил
Не просто шестнадцать лет.
Я, кажется, помню юность,
Мне было просто шестнадцать.
И синие незабудки
Цвели на лице твоем,
И мне, просыпаясь утром,
Хотелось только смеяться.
И утро со мной смеялось
Звонкоголосым дождем!
Но осень меняет лица.
Но осень меняет взгляды.
Попрятались незабудки
Под голубой платок.
Ты стала мудрей и старше,
Что в жизни, конечно, надо...
А мне «не просто
шестнадцать»,
Мешают, как будто сто.
Мы бродим по мокрым
скверам.
Нам кажется дождь соленым.
О чем ты нам шепчешь, лето,
Губами мокрой листвы?
Я, кажется, верил в чудо.
Я, кажется, был влюбленным.
Я где-то читал, что осень
Не мешает любви.

**А. УСЕНЯ**

## СВЯТА

Ёсць на зямлі найлепшае свята,
Свята без лозунгаў і сцягоў.
Свята, калі расцвітаюць
дзяўчаты
Цуда-пралескамі з-пад снягоў.
Сонца—
Усмешкамі ззяе на тварах,
Неба—
У сініх дзявочых вачах,
Шчырасць—
У светлых дзявочых марах,
Вёсны—
У думках і песнях дзяўчат!
Радасць нясе сакавіцкае ранне,
Шчасце
Акрэсліваючы сабой.
Знікнуць у сэрцах дзявочыя
раны,
Згіне ў сэрцах дзявочых боль...
Далі абудзяцца песняй
прыўзнятай,
Мары паклічуць да новых
шляхоў.
Ёсць на зямлі найлепшае
свята—
Свята шчаслівых дзявочых
сноў...

ХВЕДАР не любіў горад. І што тут добрае? Пыльна, горача, грыбы не растуць і нават дождж, здавалася хлопцу, не такі ідзе, як у вёсцы. Вось і цяпер ён абыякава крочыў да электрычкі, каб паехаць да бабулі. Часу было яшчэ шмат. Але рабіць штосьці, каб мэтанакіравана скарыстаць яго, не хацелася — усё неяк надакучыла, абрыдла. Нельга было сказаць, што ён хлопец з дзівацтвамі, але нешта такое ў ім было. Сябры і дзяўчаты называлі яго Фрэдам, але ён ніколі не адзываўся на гэта імя. Хведарам звалі яго дзеда, бацьку таксама. А ён што? Горшы? Хай смяюцца, хай пагарджаюць. Яму не страшна. Нават пры знаёмстве з дзяўчатамі так і называўся — Хведар, што заўжды выклікала ўсмешкі і здзіўленне. Які ёсць. І няма чаго пад уплывам усялякіх мод, прыгожых імён мяняць свае звычкі. Самакрытычна адносячыся да сябе, Хведар лічыў, што яго галоўным недахопам было алэндэлонаўскае аблічча. Сапраўдны артыст. Па вуліцы прайсці нельга, каб не звярнуць на сябе ўвагу. А ён працаваў звычайным слесарам.

Вагон амаль пусты. Уладкаваўшыся ля акна, хлопец пачаў разглядаць прахожых. Як у кіно, мільгалі розныя твары людзей. Адны спяшаліся, другія чакалі, трэція проста стаялі.

— Баба, а ета во што?

Малы з бабуляй сядзеў ля акна насупраць, паказваючы пальчыкам на чырвоны, як памідор, цеплавоз. Хлопец усміхнуўся. Яму да драбніц знаёма ўсё цеплавознае, усё, што хаваецца за прыгожай чырвонню абшыўкі.

— Гэта, унучак, машына. Людзей возіць.

Малы з цікавасцю ўглядаецца ў цеплавоз.

— А дзядзі грошыкі бяруць, як і татка?




Бабка спалохана пасоўваецца да малога і азіраецца па баках...

Юнак пераводзіць позірк на маладую жанчыну з немаўляткам на руках, на купку прыліпшых да акон хлапчукоў. Вось і ўсе пасажыры. Хведар бярэ ў рукі абрывак газеты з сядзення насупраць. Чытае. Журналіст задае пытанне вядомаму артысту. Хлопец шпарка прабег вачыма колькі радкоў і раптам спыніўся. «Які дзень у вашым жыцці больш за ўсё запомніўся? І што, на ваш погляд, з'яўляецца самым галоўным...» — і тут інтэрв'ю абрывалася. Хтосьці неміласэрны расправіўся з газетай, адарваўшы, бадай, самае цікавае месца. Хлопец задумаўся. А што ў яго жыцці было самым цікавым? Які быў дзень самым яскравым? І што ён паспеў зрабіць у свае васемнаццаць год? А ці быў у яго такі дзень? Быў! Толькі не дзень, а ноч. І ён даўно чакаў, каб той сон стаў явай. Чакаў летуцення, чакаў наіўна.

Грынаўская Асоль і Хведар. Што аднолькавага? Нешта было. А прызнацца ў гэтым не мог — засмяюць. Яны абодва былі прыгожыя? Але. Можа шчэ што? Невядома. Але было, было падабенства! Няхай яно, каханне, і незвычайнае, няхай не падобнае ні на якое іншае, але яно было чыстае, як дзіцячая сляза, і верыў Хведар у сустрэчу з той, адзінай. Верыў, хоць і не раз расчароўваўся, стараючыся з тою сустрэцца, якую шукаў. Такіх, на жаль, не было.

У тую ноч, год назад таму, Хведару прысніўся дзівосны сон. Ён да апошніх драбніц памятае яго. Хлопец і сам не ведаў, чаму так здарылася. Была вясна, былі юначыя мары. Было шмат сяброў, на няўвагу дзяўчат ён не скардзіўся. Але не было той. Той, каго прысніў майскай ноччу. Прачнуўшыся, ніяк не мог прыйсці ў сябе. Было да слёз шкада. Хлопец так яўна яе бачыў, адчуваў дыханне, чуў патаемнае шапаценне і перазвон лёгкіх валасоў. Але чарнавокай прыгажуні не было. Хоць менавіта ёю ён трызніў даўно, шукаў. У сне яна стаяла ў невялікім пакойчыку, вабячы да сябе. У акно заглядвала сонца. Промні ласкава абдымалі яе, рабілі ўражанне незвычайнага, незямнога, загадкавага. Хведар адразу ж назваў яе Алесяй. Яго Алесяй. Дзяўчына павярнулася і глянула на яго. Вясёлкай пырснула ўсмешка з яе вачэй і вуснаў. Хлопец аж здрыгануўся, трывожна затукала сэрца, але ў адказ усміхнуцца не змог. Дзяўчына, разгубленая з яго незразумелага выгляду, павольна схавала ўсмешку. На твары засталіся вясёлыя вочы, і вусны гаварылі аб сур'ёзнасці і рашучасці яе незразумелага пакуль намеру. Яна зрабіла крок да яго, узнімаючы руку з блакітным букецікам. Вочы і вусны. Зямля і неба. Хведар хацеў устаць, ды не змог. Перахапіла дыханне, трывогай заныла ў сэрцы. Бы плывучы, яна павольна набліжалася да яго...

Хлопец страсянуў галавой. Цяжка яшчэ спакойна ўспамінаць той сон. Ён і тады не адразу разабраўся, ці сон гэта быў, ці было наяву. Маці не пазнавала сына. І ў школе пыталіся пра здароўе. Часам яму самому было смешна з таго здарэння. Але Алесіны вочы раптам паўставалі перад ім так выразна, быццам яна хвіліну назад была побач. І колькі разоў ён хацеў сасніць яе яшчэ раз, але безвынікова. Шукаў наяву. Не знаходзіў. Вось і цяпер, здаецца, яна стаіць і ўсміхаецца яму. Гарадзь вясёлкай вочы. Сцяты непакорна вусны...

Хведар чуць не ўскрыкнуў. Ці гэта зноўку сон?..

— Шура! Шурка!.. — данёсся крык з перона.

... Дзяўчына стаяла ля яго вагона і, не адрываючыся, глядзела на хлопца. «А можа гэта яе завуць?» Хлопец не верыў сваім вачам. Яна! А мо не? «Ну павярні галаву! Там, на шыі, павінна быць радзімка!»

— Ці ты не чуеш? Алеся!— зноў пачуўся голас. Яна павярнулася. Ля загарэлага пляча журавінкай бліснула радзімая плямка. І яшчэ ён заўважыў у руцэ блакітны букецік. Яна!..

Са зміїным шыпеннем закрыліся дзверы. Поезд крануўся. Хлопец сарваўся з месца.

— Алеся!..

Дзяўчына трывожна павярнулася на вокліч, шукаючы вачыма Хведара...

— Алеся!..

Яго голас зліўся з гудком электрычкі, які жураўліным крыкам адазваўся ў чэрвеньскім небе...

**М. ДУБОВІК.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

АТ 15088 Заказ № 403.

6 сакавіка 1980 г.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19

В. а. рэдактара
В. П. ВАРАБ'ЁЎ